## XI СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

# Прамова дэпутата Н. Я. НАТАЛЕВІЧА

Таварышы дэпутаты! Прыемна ўсведамляць, што адкрыццё і пачатак работ XI сесіі Вярхоўнага Совета СССР супала з хвалюючымі і радаснымі для нас, совецкіх людзей, падзеямі, якія маюць велізарнае гістарычнае і міжнароднае значэнне.

Наша доблесная Чырвоная Армія, кіруемая геніяльным палкаводцам Маршалам Совецкага Саюза таварышом Сталіным, уступіла ў Берлін—сталіцу разбойніцкай фашысцкай Германіі.

Гістарычныя перамогі совецкага народа над злейшым ворагам прагрэсіўнага чалавецтва—фашысцкай Германіяй з'яўляюцца перамогамі вялікіх ідэй партыі Леніна—Сталіна, перамогамі совецкага ладу, перамогамі мудрай палітыкі нашай партыі і совецкага ўрада. Гэтыя гістарычныя перамогі нашага народа паказалі магутнасць, непахісную моц совецкага ладу.

Вось чаму ў гэтыя радасныя дні бліскучых перамог нашай доблеснай Чырвонай Арміі сэрца кожнага совецкага чалавека поўна гордасці за свой гераічны народ, за сваю армію, за сваю магутную дзяржаву, за стваральніка і мудрага кіраўніка Совецкай дзяржавы, які забяспечыў нашаму народу перамогу над ворагам,—за таварыша Сталіна. (**Апладысменты**).

Беларускі народ разам з усім совецкім народам адчувае вялікую радасць у сувязі з бліскучымі перамогамі Чырвонай Арміі. Працоўныя Беларусі, якія перанеслі страшэннае гора і пакуты пад пятой нямецкіх захопнікаў, не шкадуюць ні сіл, ні сродкаў для аднаўлення народнай гаспадаркі рэспублікі, для справы перамогі над ворагам і далейшага ўмацавання ма-

Народных Камісараў СССР на разгляд і зацвярджэнне сесіі Вярхоўнага Совета СССР у суме 305.251.754 тысяч рублёў, прапаную зацвердзіць. Дзяржаўны бюджэт адлюстроўвае непахісную волю і спадзяванні ўсяго совецкага народа—хутчэй пакончыць з ненавісным ворагам. Важнейшым артыкулам бюджэта гэтага года з'яўляюцца ваенныя выдаткі, якія прадугледжваюцца бюджэтам СССР на 1945 год у памеры 137 млрд. рублёў. Галасуючы за гэту лічбу, мы, дэпутаты Вярхоўнага Совета, цвёрда ўпэўнены ў тым, што нашу думку цалкам і поўнасцю раздзяляюць нашы выбаршчыкі.



Прамысловасць Беларусі падверглася варварскаму разбурэнню з боку нямецкіх захопнікаў. Будынкі прадпрыемстваў спалены або ўзарваны, абсталяванне поўнасцю вывезена. З сотні тысяч кіловат магутнасцей, якія мела рэспубліка да вайны, асталося дзеючымі толькі пяць процантаў. З дзесяткаў тысяч станкоў асталіся толькі адзінкі.

Сельскай гаспадарцы Беларусі нанесены вялікія страты. Поўнасцю разбураны машынна-трактарныя станцыі з іх абсталяваннем. Пасеўныя плошчы пад пасевамі культур скараціліся на 40 процантаў, плошча пад бульбай у два разы, плошча пад ільном у 8 разоў. Пагалоўе коней скарацілася на 70 процантаў, буйнай рагатай жывёлы—на 77 процантаў, свіней—на 92 проценты і авечак—на 83 проценты. Грамадскае птушкаводства знішчана поўнасцю.

Паводле прамых дырэктыў германскага ўрада гітлераўскія варвары бязлітасна знішчылі навукова-даследчыя інстытуты, школы, тэатры, клубы, больніцы, дзіцячыя сады і яслі. Немцы вывезлі з рэспубліканскай дзяржаўнай бібліятэкі імені Леніна 1,5 мільёна каштоўных кніг.

Разбуран універсітэт. Разграблен велізарны будынак Акадэміі навук з дзевяццю інстытутамі. Дзяржаўная філармонія, кансерваторыя, знішчана дзяржаўная карцінная галерэя, а карціны і скульптуры вядомых рускіх майстраў вывезены ў Германію.

Апрача матэрыяльных страт, нанесеных нямецкімі разбойнікамі, гэтыя каты нанеслі нам такія страты, якія не могуць быць пакрыты ніякімі матэрыяльнымі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы